# ЭТНАГРАФІЧНАЯ ЭКСПАЗІЦЫЯ “СА СТАРЫНЫ ГЛЫБОКАЙ”

Філіял “Сінькоўскі Дом культуры”

Смаргонскі раён, аграгарадок Сінькі, вуліца Цэнтральная, 1

Час працы: серада – нядзеля: 11.00-20.00, перапынак: 15.00-16.00

Этнаграфічная экспазіцыя “Са старыны глыбокай” створана ў адпаведнасці з абласной праграмай стварэння музеяў і музейных экспазіцый ва ўстановах культуры, адукацыі і аб’ектах гісторыка-культурнай спадчыны Гродзенскай вобласці на 2017 - 2018 г.г. У праграме прадстаўлены музейныя экспанаты, зборам якіх займаліся супрацоўнікі Дома культуры з 2009 года. Першы раздзел музейнага пакоя пазнаёміць нас з прыладамі для апрацоўкі ільна: мялка, трапло, часалкі, калаўрот, прасніца, элементамі ткацкага станка. У дадзенай экспазіцыі прадстаўлены разнастайныя ручнікі і посцілкі, выраблены на ткацкім стане (кроснах). Да дадзенай экспазіцыі таксама адносяцца тканыя посцілкі, дарожкі-палавікі . Цікавыя прадметы хатняга ўжытку, такія, як металічная форма для выпечкі, станок для змялчэння табака, якімі карысталіся нашы продкі, прадстаўлены ў экспазіцыі разам з самаварам, гліняными збанкамі, плеценымі кошыкамі, вышытымі карцінамі, драўлянымі прыстасаваннямі. У музейным пакоі можна ўбачыць традыцыйныя прылады працы і прыстасаванні, без якіх нашы продкі не абыходзіліся ў паўсядзённай

сялянскай працы ў полі, падворку, хляве: цэп, серп, граблі, драўляныя колы ад коннага воза, хамут кувалда,каса і інш. Экспанатамі гэтай экспазіцыі з’яўляецца жаночае і мужчынскае адзенне (кажух, плюшавікі, хустка-ахіначка, муфта) першай паловы XX стагоддзя. І да гэтага часу, калі у хаце з раніцы марозам холадна, гаспадыня не замерзне. На дадзены момант у музейным пакоі налічваецца больш за 130 экспанатаў, якія трапляюць сюды шляхам пошукава-даследчай работы, некаторыя з іх падораны жыхарамі суседніх вёсак. Для наведвальнікаў этнаграфічнай экспазіцыі “Са старыны глыбокай” філіяла “Сінькоўскі Дом культуры”, падчас правядзення агляднаадукацыйных экскурсій, арганізоўваюцца майстар-классы, міні-квэсты, дэгустацыі страў Сінькоўскага рэгіёна.









# ЭТНАГРАФІЧНАЯ ЭКСПАЗІЦЫЯ “АДКУЛЬ НАШЫ КАРАНІ”

Філіял “Раённы Дом рамёстваў”

Адрас: Смаргонскі раён, аграгарадок Залесье, вуліца Савецкая, 14

Час працы: аўторак – субота: 09.00-18.00, перапынак: 13.00-14.00

Спадчына – гэта набытак чалавецтва. Стварэнне этнаграфічнай экспазіцыі “Адкуль нашы карані”, якая дзейнічае ў філіяле “Раённы Дом рамёстваў” – вынік працы, якую праводзіў Дом рамёстваў па выяўленню і аднаўленню мясцовых традыцыйных рамёстваў Смаргонскага раёна, супрацоўніцтва з навучальнымі і навуковымі ўстановамі, удзел у навуковадаследчай рабоце, правядзенне экспедыцый па збору найбольш каштоўных мастацкіх рамёстваў. На дадзены момант у музейным пакоі налічваецца 103 экспаната. Першы раздзел музейнага пакою пазнаёміць нас з цэнтральным месцам былой сялянскай хаты – чырвоным кутом, дзе размешчаны абразы. Пад абразамі – засланы абрусам стол. Згодна традыцыі, на стале заўсёды пакідалі хлеб, накрыты ручніком. За сталом збіралася разам ўся сям’я, цэнтральнае месца займаў гаспадар. На першы план у гэтым раздзеле выносяцца вышываныя ручнікі, абрусы. У дадзенай экспазіцыі прадстаўлены ў асноўным разнастайныя ручнікі (абрадавыя, штодзённага ўжытку, набожнікі, аброчныя), выраблены на ткацкім стане (кроснах) і аздобленыя вышыўкай. Есць тут таксама і тканыя посцілкі, дарожкі-палавікі (падножнікі,ходнікі). У “Бабіным куце” наведвальнікі змогуць

пабачыць рэчы хатняга ўжытку: вілкі розных памераў, чапяла, венік-дзяркач, дзяжа для закваскі хлеба, маслабойка і іншы гаспадарчы посуд, якім карысталася гаспадыня. Таксама прадстаўлены традыцыйныя прылады працы і прыстасаванні, без якіх нашы продкі не абыходіліся ў паўсядзённым жыцці: цэп, серп, калаўрот, лубка, станок трапальны, берда. Падчас экскурсій па музейнай экспазіцыі “Адкуль нашы карані” праводзяцца розныя інтэрактывы з наведвальнікамі: тэматычныя гульні, дэманстрацыя працы на ткацкім станку, майстар-класы па побытавых танцах.









